Сафроненка Г. Б., студ. гр. 138 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гарадніцкі Я. А.,
канд. філал. навук, дацэнт

# УПЛЫЎ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ІДЭЙ К. КАЛІНОЎСКАГА НА ТВОРЧАСЦЬ Ф. БАГУШЭВІЧА

Беларуская літаратура XIX ст. служыла своеасаблівым сродкам сацыяльнай камунікацыі, пры дапамозе якога прагрэсіўныя людзі неслі свае ідэі ў народныя масы. Новы светапогляд перадаваўся не толькі праз непасрэдныя зносіны асвечаных людзей з масамі і зносіны гэтых жа мас з аўтарам, апасродкаваныя яго творам. Узорам ускоснай камунікацыі праз літаратуру могуць служыць зносіны таго ж Каліноўскага з народам праз тых, чый светапогляд быў сфарміраваны пад уплывам яго ідэй – пісьменнікаў з народа, такіх як Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, Цётка і інш. Таму няма нічога незвычайнага ў тым, што ў большасці сваёй творы беларускай дэмакратычнай літаратуры паходзяць з другой паловы XIX ст., пасля паўстання. Менавіта дзякуючы Каліноўскаму наша родная мова не стала мёртвай мовай і ўсё яшчэ мае нядрэнныя шансы зрабіцца агульнанароднай, менавіта дзякуючы яму наша краіна спазнала мноства новых аўтараў дэмакратычнай плыні. Я паспрабую абгрунтаваць думку аб пераемнасці ідэй на прыкладзе творчасці Ф. Багушэвіча – самага выдатнага паэта-дэмакрата, папярэдніка Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам Каліноўскага быў наладжаны выпуск рэвалюцыйнай газеты “Мужыцкая праўда”. Дакладна невядома, ці быў Кастусь Каліноўскі аўтарам усіх нумароў “Мужыцкай праўды” ці газета пісалася рознымі людзьмі. Тым не менш, у “Пісьмах з-пад шыбеніцы”, чыя прыналежнасць Каліноўскаму была дакладна ўстаноўлена, быў знойдзены шэраг стылёвых падабенстваў да выпускаў газеты, што дазваляе гаварыць абпра тое, што ён прымаў непасрэдны ўдзел у напісанні артыкулаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У “Мужыцкай праўдзе” даступнай для селяніна мовай выкладаецца максімальна аб’ектыўны погляд на апошнія з’явы палітычнай рэальнасці. У ёй асуджалася рэформа 1861 года, якая была праведзена ў інтарэсах паноў: “А гэты маніфэст, што Цар з Сенатам і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае да чаго ён падобны, – ніякай у нём няма праўды, няма з яго для нас ніякай карысці». З самага пачатку раскрываецца талент аўтара. Напрыклад, у другім нумары, “Яська, гаспадар з-пад Вільні”, як добры палітык, пераконвае чытача ў магчымасці поспеху паўстання, асэнсоўваючы перспектывы паўстання 1794 года: «Для таго то і пабілі Маскалі Касцюшку, бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сякеры, нажы і косы, так бы Маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня, і мы на век вякоў ужэ былі бы вольныя». Ідэі “Мужыцкай праўды” пераклікаліся з поглядамі народных мас. Таму няма нічога звышнатуральнага ў тым, што яны карысталіся ў народа вялізарнай папулярнасцю. Пасля падаўлення паўстання, іх рэйтынг узрос. Такім чынам, хаця Каліноўскі памёр ў 1864 годзе, ідэйна ён працягваў існаваць да самога звяржэння самаўладства. У творчасці яго ідэйных паслядоўнікаў вайна працягвалася. Але зброяй ў ёй былі ўжо не вілы ды сякеры, а пяро і папера і вялася яна на літаратурным фронце.

Ідэі Каліноўскага знаходзяць сваё адлюстраванне ў творчасці выдатнага паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча. Прынята лічыць, што ён заклаў асновы рэалістычнай плыні ў беларускай літаратуры. Часткова з гэтым меркаваннем я згодны. Тым не менш, цалкам верагодна, што вытокі яго творчасці ўзыходзяць да публіцыстыкі “Яські – гаспадара з-пад Вільні”.

У Каліноўскага і Багушэвіча сапраўды шмат агульнага. Па-першае – узрост. Розніца ва ўзросце складае два гады. Пры гэтым творчыя здольнасці Каліноўскага разгарнуліся значна раней, чым у паэта – у 24 гады. Творчы шлях Багушэвіча пачаўся не раней за 1877 год (Н. Роўба сцвярджае, што яшчэ ў канцы 70-х гг., пад час навучання ў Нежынскім універсітэце, паэт пачаў ствараць свае першыя вершы). Гэта, прынамсі, праз трыццаць год пасля пачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

публіцыстычнай дзейнасці рэвалюцыянера. Перад тым, як пісаць на сацыяльныя тэмы, паэту, безумоўна, прыйшлося б азнаёміцца з узорамі больш ранняй літаратуры адпаведнага зместу. Тут карыснымі б аказаліся артыкулы “Мужыцкай праўды” а таксама “Пісьмы з-пад шыбеніцы”, якія прыпісваюцца Каліноўскаму. Вельмі малаверагодна, што літаратар пакінуў іх без увагі. Па-другое – сацыяльны статус. Перавага народных вяшчальнікаў з дробнадваранскага саслоўя – гэта яшчэ адна цікавая тэндэнцыя, якая мела месца ў сярэдзіне ХІХ – пачатку ХХ стагоддзяў. І Каліноўскі і Багушэвіч паходзілі з дробнай шляхты. Можна прыгадаць яшчэ з дзесятак выдатных пісьменнікаў і рэвалюцыянераў з падобным паходжаннем (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Ян Баршчэўскі і нават сам Уладзімір Ільіч Ульянаў). Калі ўлічваць абяздоленае становішча сялян на той момант і прыгадаць кошт навучання, гэта з’ява не здаецца такой звышнатуральнай.

Па-трэцяе – месца нараджэння. Абодва асветнікі паходзяць з Заходняй Беларусі. Месцам нараджэння Багушэвіча прынята лічыць вёску Свіраны каля Вільнюса (ці Кушляны ў Гродзенскай губерніі). Фактычна, гэта поўнач Заходняй Беларусі. Каліноўскі нарадзіўся на тэрыторыі сучаснага Свіслацкага раёна, у цэнтры Заходняй Беларусі. “Мужыцкая праўда” распаўсюджвалася на тэрыторыі, дзе працаваў лідэр паўстанцаў, гэта значыць пераважна ў заходніх і цэнтральных рэгіёнах беларускай часткі Расійскай імперыі, у склад якой у ХІХ стагоддзі ўваходзілі і землі Віленскага павета. У 1861 годзе Багушэвіч паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт, дзе толькі некалькі месяцаў таму праходзіў навучанне Каліноўскі, але правучыўся нядоўга. Калі студэнты-рэвалюцыянеры вырашылі правесці акцыю пратэсту, паэт праявіў салідарнасць і разам з імі адмовіўся прыняць заліковую кніжку. Калі дапусціць, што сярод пратэстуючых маглі апынуцца сябры Каліноўскага, то гэты бессэнсоўны крок здаецца ўжо больш-менш абгрунтаваным. Калі паэт нарэшце вярнуўся на Радзіму, рэвалюцыйны лідэр ужо вёў сваю вызваленчую кампанію. Факт асабістага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаёмства Багушэвіча з Каліноўскім дакументальна зафіксаваны не быў. Тым не менш, гэта было магчыма. Якраз, калі паэт настаўнічаў у адной са школ Гродзенскай губерніі (у Доцішках), Каліноўскі мог праводзіць агітацыі ў гэтым рэгіёне. Таксама, Доцішкі знаходзіліся блізка ад маёнтка А. Звяровіча, дзе ў той час жыў сябар пісьменніка – Ян Карловіч. Сам Звяровіч за ўдзел у паўстанні быў арыштаваны і высланы ў Сібір.

Багушэвіч таксама быў непасрэдным удзельнікам паўстання. Летам 1863 года ён удзельнічаў у баявой аперацыі пад Беластокам, дзе быў цяжка паранены. Пасля гэтага аўтар "Дудкі Беларускай" ужо не ваяваў. Апошнім фактам будзе багатая літаратурная спадчына Багушэвіча-публіцыста. У артыкулах яго надта цяжка правесці якія-небудзь паралелі з "Мужыцкай праўдай". Каб не падзяліць лёс паўстанцаў ён не пайшоў іх шляхам і не стаў адкрыта заклікаць народ да паўстання. Польскамоўная газета «Край», дзе аўтар публікаваўся ў перыяд найбольш актыўнай літаратурнай дзейнасці, не дапускала артыкулаў, накіраваных супраць дзеючай улады.

Зразумела, усе гэтыя факты даказваюць толькі тое, што аўтар "Дудкі беларускай" падзяляў погляды славутага рэвалюцыянера. Ці можна, кіруючыся толькі імі, гаварыць пра Багушэвіча як пра прадаўжальніка справы Каліноўскага? Каб адказаць на гэтае пытанне, я паспрабую правесці сэнсавы аналіз розных элементаў літаратурнай спадчыны абодвух аўтараў.

Як і Каліноўскі, Багушэвіч быў незадаволены маркотна вядомай рэкруцкай павіннасцю, якая адбывалася сялянамі далёка ад радзімы. Вось адпаведны ўрывак верша "Думка" са зборніка "Дудка беларуская":

"Чагось мне маркотна, на плач забірае:
Мусіць душа чуе якоесці гора…
Ці ўмрэ сын той, што маскалям служыць…"

У даным выпадку нядрэнным каментарыем могуць паслужыць некаторыя вытрымкі з "Мужыцкай праўды" накшталт гэтай: "…но скажэце, мае міленькія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чы есць памеж намі хто-лень, каб не аплаківаў яшчэ альбо сваго сына, альбо сваго брата, альбо сваго мужа, што Цар забраў яго ў рэкруты да і загнаў чорт ведае гдзе?”

Нямала паралеляў можна знайсці і ў вершы “Праўда”. На сэнсавую сувязь з “Мужыцкай праўдай” паказвае не толькі назва:

“Каб жа тое слова ды людцоў з’еднала,
Каб на тое слова ворагаў не стала…
Вазьмі-ж усе змыслы, покі прыдзе Праўда,
Бо жыць без яе нам не вяліка наўда.”

Параўнаем з першым выпускам газеты: “Но не доўга яны нас будуць абдзіраці, бо мы пазналі, гдзе сіла і праўда, і будзем ведаць, як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду. Вазьмемся, Дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам!”

Вядома ж, не трэба забываць славутыя “Прадмовы” Багушэвіча. На падабенства іх да “Мужыцкай праўды” ўжо спасылаліся даследчыкі. Ніжэй прыведзены ўрывак з прадмовы да зборніка “Дудка беларуская”: “Братцы мілыя, дзеці Зямлі-Маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя мужыцкай завуць, а завецца яна “беларускай”. Гэты кароткі зварот сваім неўтаймаваным пачуццём патрыятызму вельмі нагадвае радкі, выведзеныя старраннай рукой “Яські, гаспадара з-пад Вільні”: “Чы мая праўда горка, чы яна салодка, я пісаў заўсюды і пісаці буду - учыў я вас, як рабіці трэба, і ўчыці буду. Вы адно слухайце мяне, талкуйце добра і рабеце так, як сумленне Вам скажэ, а Бог яшчэ злітуецца над намі і дасць нам шчасце, і дабро ў нас будзе”.

Такім чынам, творчасць Францішка Багушэвіча і яго паслядоўнікаў развівалася пад уплывам беларускага рэвалюцыянера-народніка Кастуся Каліноўскага. Пры гэтым, пісьменнік не проста выкарыстаў мастацкія ідэі славутага рэвалюцыйнага лідэра, але перапрацаваў іх, вывеў на якасна новы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзровень, працягнуў справу адраджэння нацыянальнай культуры, адлюстраваў усё тое, што не паспеў народны абаронца і падаў узор усім сваім паслядоўнікам, чым падрыхтаваў глебу для развіцця беларускай літаратуры.

Спіс літаратуры


1. Александровіч С. Тут зямля такая… – Мінск : Народная асвета, 1974.
2. Барысенка В. В., Івашын В. У. Беларуская літаратура. – Выданне 16-е. – Мінск : Народная асвета, 1975.
3. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст.: Падруч. Для філал. фак. пед. ВНУ/ І. Э. Багдановіч, У. В. Гніламёдаў, Л. С. Голубева і інш.; Пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мн.: Выш. шк., 1998. – 560 с.
4. Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. – Мн., "Беларусь", 1988.

Францішак Багушэвіч. Выбраныя творы. – Дзяржаўнае выдавецтва БССР. – Мінск, 1952.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ